Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-12-28



**Насамрэч, рэдка калі бывае так, што прэзентацыя навукова-даведачнага выдання становіцца сапраўдным бенефісам навукоўца, якому яно прысвечана, па-сямейнаму цёплай сустрэчай аднадумцаў, яркім сугуччам сэрцаў, душ і галасоў... Галасоў жывых, якія чутны цяпер і тут, і галасоў вечных, якія тым не менш таксама здаюцца прысутнымі цяпер і тут. Але такое іншы раз здараецца і ў нашым сённяшнім, па вялікім рахунку, глухім да асобнага чалавечага голасу часе.**



# Сугучча галасоў жывых і вечных

Нядаўна ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбылася прэзентацыя кнігі "Мажэйка Зінаіда Якаўлеўна. Да 50-годдзя навуковай і творчай дзейнасці" (Мінск, "Тэхналогія", 2013). Педагогам і навукоўцам, чыё поле дзейнасці ў той ці іншай ступені звязана з культуралогіяй і беларусістыкай, мабыць, не трэба тлумачыць, хто яна такая, этнамузыколаг і этнакінематаграфіст, доктар мастацтвазнаўства, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Зінаіда Якаўлеўна Мажэйка і што яна зрабіла для беларускай культуры ў цэлым. А вось што тычыцца больш шырокіх колаў педагагічнай грамадскасці, без дастаткова падрабязных тлумачэнняў будзе не абысціся. І, напэўна, лагічна будзе пачаць з кароткіх агледзін жыццёвага і творчага шляху З.Я.Мажэйка, з чаго, дарэчы, пачынаецца і кніжка, пра якую ідзе гаворка.



Студэнтка Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. 1957 г.

З уступу "Ад укладальнікаў" (кандыдатаў мастацтвазнаўства дацэнтаў Тамары Якіменка і Тацяны Бярковіч) мы даведаемся, што Зінаіда Якаўлеўна нарадзілася 6 снежня 1933 года ў Оршы ў сям'і службоўца. Яшчэ перад вайной, калі сям'я жыла ў Маладзечне, займалася ў падрыхтоўчым класе музычнай школы (віяланчэль). Вайна застала сямігадовую Зіну ў Мінску, куды яна разам з маці і пяцігадовым братам прыехала да сваякоў у госці да цёткі Ванды якраз у чэрвені 1941 года. Першыя бамбёжкі і першыя цяжкія жыццёвыя выпрабаванні: разам з брацікам дзяўчынка згубілася ў агні разбомбленага Мінска, а выбегшы адтуль разам з натоўпам, яны амаль тры месяцы блукалі па лясах і вёсках Мінскага і Чэрвеньскага раёнаў. Нейкім цудам беспрытульныя малыя дзеці ўсё ж вярнуліся ў верасні ў акупаваны Мінск, успомнілі адрас цёткі Ванды, якая сустрэла іх са словамі: "А дзетачкі мае, мы ж вас ужо даўно пахавалі!" Потым іх знайшла маці Сцепаніда Іванаўна і другая цётка Ганна Іванаўна, якая жыла ў Лепельскім раёне. Бацька Якаў Дарафеевіч Мажэйка з першых дзён вайны служыў кадравым афіцэрам у контрразведцы, а Зіна з маці, братам і цёткай тым часам перабраліся на Лепельшчыну, у партызанскую зону, дзе і правялі астатні ваенны час.

У 1951 годзе Зіна Мажэйка з залатым медалём скончыла сярэднюю школу ў г.п.Халопенічы Мінскай вобласці, паступіла на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ, дзе, праўда, не затрымалася, а паступіла ў Мінскае музычнае вучылішча па спецыяльнасці "тэорыя музыкі", пасля вучылішча — у Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па спецыяльнасці "Музыказнаўства". Надзвычай важным перыядам стала для З.Я.Мажэйка аспіранцкая падрыхтоўка пад кіраўніцтвам вядомага ленінградскага этнамузыколага Я.У.Гіпіуса, паслядоўніка легендарнага Барыса Асаф'ева, які распрацаваў інтанацыйную тэорыю ў даследаванні вуснай народнай творчасці. Фактычна Я.У.Гіпіус і Л.С.Мухарынская (навуковы кіраўнік З.Я.Мажэйка ў нашай кансерваторыі) і асвяцілі далейшы навуковы і творчы шлях Зінаіды Якаўлеўны — займацца фундаментальнай этнамузыкалогіяй, практычнай фалькларыстыкай (пошукамі сапраўдных скарбаў аўтэнтычнага народнага мастацтва), так званай візуальнай культурнай антрапалогіяй (у першую чаргу ў якасці этнакінематаграфіста).

На працягу амаль 50 гадоў (з 1962 па 2011) З.Я.Мажэйка працавала ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі — малодшым навуковым супрацоўнікам, старшым навуковым супрацоўнікам, вядучым навуковым супрацоўнікам. Што ўяўлялі гэтыя 50 гадоў у рэальнай навуковай і творчай даробцы? Тысячы навукова-даследчых паездак і фальклорных экспедыцый, сотні публікацый і выступленняў на канферэнцыях, дзясяткі манаграфій і раздзелаў у кніжных выданнях, тузін грампласцінак традыцыйнага музычнага фальклору і дакументальных этнамузычных ды антрапалагічных фільмаў, шматлікія этнаграфічныя канцэрты-паказы выканаўцаў самабытнай палескай песні... Дарэчы, у кнізе ўсё пералічанае скампанавана ў тры вялікія раздзелы: храналагічны паказальнік работ З.Я.Мажэйка; водгукі аб іх (Я.Гіпіус, М.Талстога, С.Грыцы, М.Сабінінай, Г.Галавінскага, І.Зямцоўскага, В.Гусева, Л.Мухарынскай, У.Конана і інш.); газетныя інтэрв'ю і храналогія публікацый у прэсе пра манаграфіі, кінафільмы, этнаграфічныя канцэрты самабытных гуртоў.





Але вернемся да прэзентацыі выдання. Можна было б цытаваць тут многіх — калег-навукоўцаў, рэдактараў, проста аднадумцаў Зінаіды Якаўлеўны, якія прыйшлі выказаць сваё захапленне яе постаццю і творчасцю. Чаго вартыя, напрыклад, толькі словы прафесара, доктара мастацтвазнаўства, загадчыка кафедры беларускай музыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Вольгі Уладзіміраўны Дадзіёмавай, якая параўнала зробленае З.Я.Мажэйка з велічным гожым замкам са шматлікімі святліцамі. "Гэты замак-гмах немагчыма ахапіць позіркам, настолькі шматвектарная дзейнасць Зінаіды Якаўлеўны — і збор неўміручых узораў беларускага фальклору, якія нясуць у сабе бясцэнную інфармацыю пра карнявыя існыя каштоўнасці беларускага народа, і асветніцкая (я маю на ўвазе яе фільмы), і выкладчыцкая... Але ўсё ж гэты гмах адкрываецца нашаму здзіўленаму позірку, і мы нават не можам уявіць, як ажа адкрываўся ён ёй адной, калі займацца ўсім гэтым было і непрэстыжна, і некан'юнктурна, і нават небяспечна. Сапраўды, Зінаіда Якаўлеўна здзейсніла подзвіг".



На 70-гадовым юбілеі З.Мажэйка. Песенны дуэт з Янкам Саламевічам. 2003 г.

І быў на прэзентацыі, вядома ж, самы сакральны момант — выступленне самой Зінаіды Якаўлеўны Мажэйка. І пачынаўся ён з такіх слоў: "Як бы я хацела сядзець сёння ў гэтай зале побач з Іванам Уладзіміравічам Саламевічам, нашым знакамітым энцыклапедыстам, які напісаў для гэтай кнігі грунтоўны артыкул пра мяне і маю дзейнасць "Найярчэйшы беларускі прадстаўнік этнамузыкалагічнай навукі", які ўзяў у якасці эпіграфа да гэтага артыкула словы Веры Палтаран "Чалавек на вятрах часу", які фактычна выступіў з ідэяй стварыць такую кнігу, дзе была б сабрана ўся я і ўсё маё..."



У "сямейна-альпінісцкай" звязцы з заслужаным трэнерам Рэспублікі Беларусь Яўгенам Коўбанам. 2007 год (год іх залатога вяселля).

Потым была дастаткова працяглая паўза, пасля чаго Зінаіда Якаўлеўна прадоўжыла: "Вы ведаеце, у Івана Уладзіміравіча Саламевіча не было для мяне слова "працаваць" ці "рабіць". Для мяне ў яго было толькі слова "выконваць". Не рабі, а менавіта выконвай, выконвай і выконвай... Іван Уладзіміравіч быў адным з рэдкіх і прынцыповых паслядоўнікаў той кагорты магікан-навукоўцаў, якія заснавалі фундаментальную гуманітарную беларускую навуку яшчэ ў 20-х гадах XX стагоддзя. І як фундаментальны гісторык-энцыклапедыст ён выдатна разумеў, што і я падымаю фундаментальныя карнявыя пласты, у прыватнасці, у беларускай этнакультуры. У пэўным сэнсе як навуковец з аб'ёмным бачаннем развіцця беларусістыкі ён паставіў мае задачы і абавязкі побач са сваімі, якія заключаліся ў глыбокім аналізе, дакладнай храналагізацыі аўтэнтычнага фальклорнага руху і яго даследаванні. Ён так мне і гаварыў: "Сама ты ўжо сабе не належыш. Невядома, калі паўторыцца і ці паўторыцца ўсё тое, што ты выцягнула на свет. Ты павінна ўзнавіць да драбніц храналогію сваёй дзейнасці ад першага да апошняга артыкула, ад першай да апошняй экспедыцыі, ад першай да апошняй сустрэчы з аўтэнтычным носьбітам... А таму выконвай!"



У кінаэкспедыцыю з пісьменнікам Уладзімірам Караткевічам. Сышліся роднасныя натуры, прывязаныя да чароўнай таямнічасці балотных краявідаў. 1970 г.

Фактычна Зінаіда Якаўлеўна пераказала прысутным змест артыкула Янкі Саламевіча, які ўвайшоў у кнігу і стаў яе адмысловай іскрынкай, квінтэсэнцыяй. Уважліва ўслед за энцыклапедыстам расстаўляла акцэнты. Прыгадвала канкрэтныя гісторыі. Напрыклад, пра першы канцэртны паказ самабытных спевакоў з палескіх вёсак Тонеж і Клятная, які адбыўся ў 1968 годзе і меў рэакцыю выбуху ў асяроддзі творчай інтэлігенцыі. У прыватнасці, вядомы этнограф М.Грынблат, калі ўбачыў тых спевакоў, амаль са слязамі ўсклікаў: "Як быццам гэта старонкі майго жыцця 20-х гадоў. Гэта я на творчым грэбені хвалі нацыянальнага адраджэння выступаю ў самабытным "тэатры на калёсах" трупы Уладзіслава Галубка!" Натуральна, тагачаснае чыноўніцтва прарэагавала на той канцэрт палешукоў цалкам супрацьлеглымі эмоцыямі.

І пра першы, зняты ў 1971 годзе па яе сцэнарыі этнадакументальны фільм "Палескія калядкі", калі падчас аднаго з паказаў проста ў зале кінатэатра падняўся адзін салідны партыйны функцыянер і пачаў абурацца: "Трэба ж было ўсё жыццё змагацца супраць гэтага, каб у старасці зноў убачыць на экране!" Невыпадкова, што наступны фільм З.Я.Мажэйка "Галасы вякоў" выйшаў на экран толькі праз 7 гадоў.

І пра тое, што, калі аднойчы чыноўнікі ад кнігадруку паспрабавалі не даць ходу рукапісу зборніка "Песні Беларускага Паазер'я", яны аддалі гэты рукапіс на "чорную" рэцэнзію аднаму з самых строгіх і грозных рэцэнзентаў, які дакладна павінен быў бы пахаваць кнігу. Гэтым рэцэнзентам быў... кандыдат філалагічных навук Іван Саламевіч, які ў закрытай рэцэнзіі даў вельмі высокую ацэнку рукапісу.

Зінаіда Якаўлеўна ўзгадала, што быў пэўны час, калі Янка Саламевіч працаваў над артыкулам і асабліва цікавіўся яе ліставаннем з калегамі-навукоўцамі, аднадумцамі з самых розных краін. Гэтую шматтысячную перапіску ён нават падзяліў на тры ўмоўныя групы: лісты сельскіх спевакоў і музыкаў з соцень вёсак Палесся, Паазер'я і Падняпроўя; лісты вучоных навуковых арганізацый; допісы з Інтэрнацыянальнага біяграфічнага цэнтра ў Кембрыджы і Амерыканскага біяграфічнага інстытута, у навуковыя саветы кансультантаў якіх уваходзіць З.Я.Мажэйка. "Ён настойліва прасіў мяне сабраць усю перапіску, не ўпусціць ніводнага ліста. Было адчуванне, што ён марыў пра грандыёзны летапіс, які збіраўся зрабіць на аснове гэтай перапіскі. І што тут ён таксама возьме мяне за жабры і скажа сваё "Выконвай!".

Артыкул "Найярчэйшы беларускі прадстаўнік этнамузыкалагічнай навукі" стаў апошнім артыкулам Янкі Саламевіча. Кнігі "Мажэйка Зінаіда Якаўлеўна" з гэтым артыкулам ён ужо не паспеў пабачыць.

Але ў кнізе жывое і вечнае...

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*

**Фота з кнігі "Мажэйка Зінаіда Якаўлеўна. Да 50-годдзя навуковай і творчай дзейнасці".**